# СТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАЙ СІСТЭМЫ ПАКАРАННЯЎ У БЕЛАРУСІ Ў 20-я гг. XX ст.

***С. А. Гур'еў***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Як і ў першыя гады савецкай улады, пасля ўтварэння Беларускай ССР крымінальнае права рэспублікі грунтавалася на расійскіх законах і на рэвалюцыйнай правасвядомасці. Суддзі часам адвольна вызначалі крымінальнасць дзеяння, від і памер пакарання. Судовыя органы прымянялі: грамадскае асуджэнне, выгавар, строгі рэвалюцыйны выгавар, забарону займаць тую ці іншую пасаду, паражэнне правоў, грашовы штраф, канфіскацыю маёмасці, высылку за межы БССР, накіраванне ў штрафную часць (ваеннаслужачых), прымусовуюпрацу, пазбаўленне волі, расстрэл. Смяротнае пакаранне як часовая мера было ўведзена ў пачатку 1918 г. У 1919 г. 14 % усіх прыгавораў складалі расстрэлы. Першая афіцыйная адмена смяротнага пакарання адбылася ў 1920 г. спецыяльным Дэкрэтам Саўнаркама, аднак толькі на два месяцы. 24 мая 1922 г. быў прыняты Крымінальны кодэкс (КК) РСФСР, дзеянне якога пашыралася і на БССР. Рэгламентаваныя ім пакаранні
насілі адкрыта класавы характар. Кодэкс прадугледжваў расстрэл за
ўчыненне контррэвалюцыйных дзеянняў, бандытызм і некаторыя іншыя асабліва небяспечныя для савецкай улады злачынствы. Смяротная кара не прымянялася да асоб, якія не дасягнулі ў момант
учынення злачынства 18-гадовага ўзросту, да цяжарных жанчын і рэдка прымянялася да рабочых і сялян. Увогуле, стваральнікі КК 1922 г. паходзілі з таго, што злачынца – гэта чалавек, які небяспечны
толькі ў гэты час, таму яго патрэбна альбо ізаляваць, альбо паспрабаваць выправіць, аднак ні ў якім разе яму нельга помсціць. Адразу ж пасля заканчэння грамадзянскай вайны ў савецкім праве пачаў права дзіцца прынцып, згодна з якім няма пакаранняў, а ёсць толькі меры сацыяльнай аховы савецкай дзяржавы ад няўстойлівых элементаў, якія выпадкова апынуліся на злачынным шляху і якіх не трэба караць, а толькі выпраўляць шляхам перавыхавання. Самі тэрміны «пакаранне» і «віна» выключаюцца, турмы былі перайменаваны ў выхаваўча-працоўныя дамы. Тым не менш назіралася значная разнастайнасць мер рэпрэсіі, што давала судам шырокі выбар па ўжыванню таго ці іншага пакарання. Адмаўленне ад паняцця пакарання не азначала якіх-небудзь прынцыповых змен у савецкім крымінальным праве. 23 верасня 1928 г. быў прыняты КК БССР. У ім злачынствы падзяляліся на

накіраваныя супраць асноў савецкага ладу і ўсе астатнія. Мерамі сацыяльнай абароны з'яўляліся: расстрэл; аб'яўленне ворагам працоўных з пазбаўленнем грамадзянства БССР ці іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства СССР з выгнаннем назаўсёды з дзяржавы; пазбаўленне волі са строгай ізаляцыяй; пазбаўленне волі без строгай ізаляцыі; прымусовыя работы без пазбаўлення волі; поўнае ці частковае пазбаўленне правоў; выдаленне за межы СССР на пэўны тэрмін; ссылка і высылка; канфіскацыя ўсёй ці часткі маёмасці; штраф; перасцярога і інш. У гэты час любая асоба магла быць асуджана толькі на той падставе, што яна будзе прызнана сацыяльна небяспечнай, без усялякага ўстанаўлення яе канкрэтнай віны. Адмоўным было і тое, што Кодэкс меў зваротную сілу і дазваляў прымяненне аналогіі закона.
Фармальна сістэма пакаранняў на этапе пабудовы савецкага крымінальнага права была даволі гуманнай. Так, вельмі шырока ўжывалася ўмоўна-датэрміновае вызваленне. Да 1937 г. максімальны
тэрмін пазбаўлення волі не перавышаў 10 гадоў, а мінімальны вагаўся ад аднаго дня да года. Меліся і істотныя недахопы, якія выцякалі з класавай сутнасці права і тагачаснай сістэмы грамадства. З 30-х гг. XX ст. каральная палітыка канчаткова адмовілася ад прынцыпаў «выпраўлення» і перайшла да іншых метадаў пакарання. Так, уводзіцца тэрмін «турэмнае зняволенне», да непаўналетніх пачынаюць прымяняцца ўсе віды пакаранняў, уключаючы расстрэл, тэрмін максімальнага пазбаўлення волі павялічваецца з 10 да 25 гадоў, адмяняецца ўмоўна-датэрміновае вызваленне і інш. У перадваенны перыяд нават уводзіцца крымінальная адказнасць за працоўныя правапарушэнні.